# Дадатак

У гэтай публікацыі ад 31.07.2020 паведамляецца наступная дадатковая інфармацыя:

Грамадзяне Еўразвязу, якія пражываюць у Велікабрытаніі, павінны падаць заяву на карыстанне Схемай пасяленцаў ЕЗ (EU Settlement Scheme) не пазней за 30 чэрвеня 2021 г., калі яны жадаюць пражываць у Велікабрытаніі пасля гэтай даты.

Заява на карыстанне Схемай пасяленцаў ЕЗ ад ураду Велікабрытаніі афармляецца ў рэжыме анлайн і даступная ўжо зараз.

Інструкцыя па карыстанні Схемай ад Міністэрства ўнутраных справаў Велікабрытаніі, у тым ліку інфармацыя пра асобаў, якія могуць ёй скарыстацца, і дадзеныя, якія ім неабходна пацвердзіць, даступная па наступнай спасылцы: https://www.gov.uk/settled-status-eu-citizens-families.

Урад Шатландыі таксама распрацаваў матэрыялы ў дапамогу тым, хто падае заяву на карыстанне Схемай пасяленцаў ЕЗ, у тым ліку інструкцыю для працадаўцаў. Гэтыя матэрыялы можна прагледзець па наступнай спасылцы: https://www.gov.scot/publications/eu-citizens-staying-in-scotland-package-of-support/

Нарэшце, у рамках кампаніі Stay in Scotland («Заставайцеся ў Шатландыі») урад Шатландыі ўдзельнічае ў фінансаванні дабрачыннай арганізацыі Citizens Advice Scotland у мэтах кансультавання і падтрымкі грамадзянаў, якія падаюць заяву на карыстанне Схемай пасяленцаў ЕЗ. Гэтая дапамога прадугледжвае магчымасць карыстання нацыянальнай гарачай тэлефоннай лініяй, дзякуючы якой можна атрымаць інфармацыю ад высокакваліфікаваных кансультантаў. Для атрымання інфармацыі, кансультацыі і падтрымкі неабходна патэлефанаваць на нумар 0800 916 9847.